# НАДЗЕЙНАЕ ПАРТНЁРСТВА ВА ЎСІМ

## Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніцтвам буйной кітайскай кампаніі

**Сувязі з Кітаем падтрымліваюцца пастаянна і на розных узроўнях. Нягледзячы на адлегласць, нашы кантакты развіваюцца. Учора ў Палацы Незалежнасці прайшла сустрэча беларускага лідара Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй праўлення і прэзідэнтам карпарацыі «Мідэа Груп» Фанам Хунбо.**

— На беларускай зямлі вы заўсёды для нас жаданыя госці, — сказаў кіраўнік нашай дзяржавы. — Мы вельмі пільна, акуратна і трапятліва ставімся да пытанняў, якія трэба рашаць паміж Беларуссю і Кітайскай Народнай Рэспублікай. Сведчаннем таму з'яўляецца ваша кампанія.

Карпарацыя «Мідэа Груп» — адзін з найбуйнейшых вытворцаў і экспарцёраў бытавой тэхнікі ў Кітаі і свеце. Яе штабкватэра знаходзіцца ў горадзе Шэндэ правінцыі Гуандун (найбольш развітая эканамічна правінцыя Кітая). Колькасць супрацоўнікаў — каля 130 тысяч чалавек. Сёння «Мідэа Груп» стварыла глабальную платформу, якая складаецца з больш чым 200 дачынных прадпрыемстваў, больш чым 60 замежных філіялаў і 12 стратэгічных бізнес-падраздзяленняў. Карпарацыя мае вытворчыя пляцоўкі, акрамя Кітая і Беларусі, у Італіі, Бразіліі, Аргенціне, Егіпце, Індыі, Японіі, В'етнаме, Тайландзе... Гадавая выручка «Мідэа Груп» перавышае 24 мільярды долараў.

«Мідэа Груп» прыйшла ў Беларусь з прамымі інвестыцыямі дзесяць гадоў таму. Разам з холдынгам «Гарызонт» кампанія наладзіла выпуск мікрахвалевых печаў, а пасля і воданагравальнікаў.

— Вы ўклалі свае фінансы, тэхналогіі, працуеце на экспарт, ствараеце працоўныя месцы. Такіх інвестараў мы вітаем, чакаем. Мы гатовы і надалей працаваць з імі — перш за ўсё з тымі, хто некалі адважыўся ўкласці свае сродкі ў эканоміку Беларусі, — запэўніў беларускі лідар кітайскага бізнесмена.

Станоўча кіраўнік дзяржавы ацаніў і той факт, што кампанія збіраецца пашыраць сваю прысутнасць у нашай краіне. Прынамсі, для Беларусі ў супрацоўніцтве з любымі канструктыўна настроенымі замежнымі партнёрамі галоўнае — узаемная выгада.

— Мы гатовы падтрымаць на аналагічных асновах любы ваш праект, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Можаце быць упэўнены, што мы працягнем аказваць усямерную падтрымку садзейнічанню і развіццю партнёрскіх адносін. Як прынята лічыць у кіраўніцтве Беларусі і Кітайскай Народнай Рэспублікі, мы — «жалезныя браты». Наш узровень супрацоўніцтва — адзін з самых высокіх у свеце.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: яму цікава даведацца меркаванне кіраўніцтва кітайскай карпарацыі пра ўмовы працы ў нашай краіне.

— Я гатовы выслухаць любыя прапановы наконт далейшага развіцця ўзаемнага супрацоўніцтва і вашых перспектыўных праектаў у Беларусі, — запэўніў Прэзідэнт. — Вы заўсёды знойдзеце не толькі разуменне з боку кіраўніцтва нашай краіны, але і ўсялякую падтрымку. Я гатовы адказаць на любыя пытанні, якія хваляюць нашых кітайскіх сяброў.

Фан Хунбо адзначыў, што задаволены вынікамі работы ў Беларусі на працягу апошніх дзесяці гадоў. Таксама ён расказаў пра намер пазіцыянаваць Беларусь у якасці базы, якая будзе пакрываць у далейшым усе краіны СНД. «Мідэа Груп» плануе развіваць ужо існуючыя вытворчасці мікрахвалевых печаў і воданагравальнікаў у нашай краіне, акрамя гэтага, запланавана вытворчасць іншай бытавой тэхнікі, такой як халадзільнікі і пральныя машыны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Меркаванне

# ВЫНІКІ САМІТУ ДЛЯ БЕЛАРУСІ



**У Бруселі ў мінулую пятніцу завяршыўся саміт «Усходняга партнёрства» з удзелам прадстаўнікоў Беларусі, Арменіі, Украіны, Малдовы, Грузіі і Азербайджана. Галоўным вынікам падзеі стала пацвярджэнне таго факта, што «Усходняе партнёрства» будзе існаваць і развівацца. Гэта важна на фоне тых гучных заяў як палітыкаў, так і аналітыкаў, якія яшчэ паўтара года таму прадвяшчалі поўны крах праграмы або адкрыта казалі, што яна ўжо мёртвая. Нічога падобнага, ініцыятыва 2009 года прадэманстравала і ў 2017-м поўную жыццяздольнасць.**

Самай важнай для Беларусі стала паступовая трансфармацыя «Усходняга партнёрства» менавіта ў тым кірунку, які нас у найбольшай ступені задавальняе. У першапачатковым фармаце ініцыятывы 2009 года было занадта шмат геапалітыкі, што аб'ектыўна перашкаджала паспяхова развіваць партнёрства. Такія ўдзельнікі, як Украіна, Малдова і Грузія, разглядалі праграму як крок на шляху ў інтэграцыю ў Еўрапейскі саюз і спрабавалі рэалізоўваць свае знешнепалітычныя інтарэсы праз яго мерапрыемствы. Краіны ЕС, не ставячыся ўсур'ёз да перспектыў еўраінтэграцыі гэтых трох краін, у той жа час разглядалі партнёрства галоўным чынам з пункту гледжання новага фармату адносін з Расіяй. Беларусь, Арменія і Азербайджан, у сваю чаргу, не думаючы аб уступленні ў Еўрасаюз, спрабавалі дабіцца больш прагматычнага парадку дня, які ўлічвае перш за ўсё іх эканамічныя інтарэсы. Такое супярэчлівае разуменне мэт удзелу ва «Усходнім партнёрстве» непазбежна цягнула за сабой рознагалоссі і блытаніну.

Час ідзе, і ўсе гэтыя гады Беларусь настойліва прасоўвала сваё разуменне патрэбнага ёй парадку дня. Мянялася і геапалітычная сітуацыя — у ЕС усё больш спее разуменне таго, што ў Еўропе складваецца занадта напружаная атмасфера і пара рабіць крокі па яе разрадцы, а не далейшай эскалацыі. Таму што Еўрасаюз прадстаўляе сабой паў-Еўропы і хоча спакойнага жыцця, а не ўсё новых і новых праблем на сваёй тэрыторыі і ў бліжнім замежжы. У гэтай сітуацыі вынікі саміту 2017 года па сутнасці фіксуюць беларуская прапановы яшчэ 2009 года — «Усходняе партнёрства» павінна быць аб прагматычным узаемадзеянні суседзяў, а не аб стварэнні новых пунктаў напружання ў Еўропе. Таму выніковая дэкларацыя саміту прынятая ў дастаткова спакойнай атмасферы і не змяшчае асуджэння і павучанняў у адрас Расіі, як хацелася тым удзельнікам саміту, якія на гэты раз апынуліся ў меншасці.

«Усходняе партнёрства» ў выніку сапраўды становіцца асаблівым вымярэннем Еўрапейскай палітыкі суседства, праграмай, у рамках якой суседзі вырашаюць важныя для іх пытанні на аснове супрацоўніцтва. Першараднай становіцца важнасць умацавання дзяржаўнай, эканамічнай і сацыяльнай устойлівасці ў ЕС і краінах-партнёрах і ролі «Усходняга партнёрства» ў суседстве ЕС. На саміце была дасягнута згода, што ўзмоцненае супрацоўніцтва, дальнабачны і ўсебаковы палітычны дыялог маюць ключавое значэнне для пераадолення агульных выклікаў і дасягнення агульных мэт. У выніковай дэкларацыі адкрыта падкрэсліваецца, што «Усходняе партнёрства» мае на мэце развіццё агульнай прасторы сумеснай дэмакратыі, росквіту, стабільнасці і ўзмоцненага супрацоўніцтва і не накіравана супраць каго-небудзь. Пры гэтым адзначаецца, што, калі сувязі з іншымі партнёрамі затрагваюць больш шырокага прыцягнення і будуць спрыяць выніковасці канкрэтных мерапрыемстваў і агульных мэт «Усходняга партнёрства», супрацоўніцтва ў кожным канкрэтным выпадку можа быць адкрытым для трэціх краін. Пацвярджаецца суверэннае права кожнага партнёра выбіраць узровень амбіцый і мэт, да якіх ён імкнецца ў сваіх адносінах з Еўрапейскім саюзам. Адкрыта прызнаецца, што аб'ём і глыбіня супрацоўніцтва вызначаюцца амбіцыямі і патрэбамі ЕС і партнёраў, а таксама тэмпам і якасцю рэформаў. Гэта важна на фоне таго факта, што пры старце ініцыятывы ў 2009 годзе Еўрасаюз быў схільны да ментарскага тону ў дачыненні да шасці краін былога СССР, запрошаных да ўдзелу.

Такім чынам, «Усходняе партнёрства» становіцца ўсё больш важным фарматам зносін Беларусі з Еўрапейскім саюзам, з дапамогай якога Беларусь імкнецца рэфармаваць сваю эканоміку, зрабіць яе больш магутнай і інавацыйнай, балазе ЕС валодае велізарнымі фінансавымі сродкамі і сучаснымі тэхналогіямі. Як гаворыцца ў фінальнай дэкларацыі саміту, для такога супрацоўніцтва, акрамя традыцыйных інструментаў, з'явіцца і новы. Мяркуецца стварэнне Еўрапейскага фонду ўстойлівага развіцця, закліканага эфектыўна мабілізаваць значныя аб'ёмы інвеставання. Важную ролю ў прагматычным супрацоўніцтве ЕС і Беларусі адыграе праграмны дакумент «20 дасягненняў да 2020 года», прыняты ў снежні 2016-га і накіраваны на дасягненне адчувальных вынікаў празрыстым і інклюзіўным спосабам. У перагледжанай шматбаковай структуры «Усходняга партнёрства» будзе распрацаваны больш інтэграваны, калегіяльны, міжгаліновы падыход да супрацоўніцтва, арыентаваны на вынікі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

## Прадстаўнікі 12 дзяржаў у Мінску

**Сёння ў беларускай сталіцы пройдзе Пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ.**

У ім прыме ўдзел намеснік Генеральнага Сакратара ЦЕІ Эрык Чарновіц. Дзесяць краін будуць прадстаўлены на ўзроўні парламенцкіх дэлегацый — Албанія, Балгарыя, Харватыя, Сербія, Румынія, Аўстрыя, Малдова, Польшча, Чарнагорыя і Венгрыя. Яшчэ дзве — Украіна і Славенія — пасламі гэтых краін.

Галоўная тэматыка пасяджэння — лічбавыя тэхналогіі ў забеспячэнні геапалітычнай бяспекі. «Інфармацыйныя тэхналогіі могуць з'яўляцца дзейсным, эфектыўным інструментам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, але толькі ў тым выпадку, калі створаны стымулы на ўсіх узроўнях», — лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Беларусі ў парламенцкім вымярэнні ЦЕІ Ірына СТАРАВОЙТАВА**.

«Лічбавая эканоміка — гэта выкарыстанне метадаў інфармацыйных тэхналогій ва ўсіх галінах эканомікі. Калі не будзе нармальнай вытворчай базы, ніякая лічбавая эканоміка не дапаможа», — гаворыць **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.** Ён адзначыў, што беларускія эксперты могуць падрыхтаваць прапановы ў тым ліку ў плане забеспячэння эканамічнай бяспекі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## Кампанент партнёрства

### Беларусь разглядае Малдову як сувязнае звяно з краінамі Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы

**Учора ў абедзвюх палатах парламента адбыліся сустрэчы з намеснікам старшыні парламента Малдовы Уладзімірам Віцюком. Спачатку малдаўскую дэлегацыю прыняў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

Як адзначыў спікер верхняй палаты, узровень супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі задавальняе беларускі бок. Гэта датычыцца сумеснай працы як у гандлёва-эканамічным, так і ў парламенцкім вымярэнні. Ён таксама дадаў, што кантакты на найвышэйшым і высокім узроўнях вызначаюцца эфектыўнасцю і неабходна прыкласці ўсе намаганні для іх далейшага развіцця. «Мы разглядаем Малдову як сувязнае звяно з краінамі Цэнтральнай, Паўднёвай Еўропы», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Пасля гэтага дэлегацыя накіравалася ў Палату прадстаўнікоў. «У нас напрацавана добрая база, цяпер мы пачынаем не з нуля, а ёсць падмурак, на якім мы можам далей працягваць нашы адносіны, — адзначыў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК.** — У нас нядрэнна выбудоўваецца супрацоўніцтва на знешніх пляцоўках, у міжнародных арганізацыях».

— Нам бы хацелася, каб мы больш актыўна працавалі на пляцоўках СНД — там, дзе вам цікава, у пытаннях супрацоўніцтва ў Еўразійскім эканамічным саюзе, у парламенцкіх вымярэннях, у эканамічных пытаннях. Безумоўна, у нас ёсць напрацаваныя моманты, якія мы маглі б дапаўняючы ўзмацняць, каб былі карысныя адно аднаму, — дадаў Баляслаў Пірштук.

Уладзімір Віцюк нагадаў, што ў гэтым годзе Беларусь і Малдова адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Ён таксама падкрэсліў высокі ўзровень узаемадзеяння дзвюх краін. На яго думку, двум бакам неабходна больш актыўна развіваць патэнцыял у такіх сферах, як сельская гаспадарка, вінаробства і транспарт.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп: «Вінавацячы Расію, дэмакраты ЗША апраўдваюць сваё паражэнне на выбарах»



Меркаваныя дзеянні Расіі з'яўляюцца выдуманай Дэмакратычнай партыяй ЗША прычынай яе паражэння на прэзідэнцкіх выбарах у 2016 годзе. Запіс такога зместу пакінуў у нядзелю на сваёй старонцы ў Твітары прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, які, як вядома, з'яўляецца рэспубліканцам.

«З таго самага дня, калі я прыйшоў да ўлады, усё, што вы чуеце, — гэта выдуманае апраўданне дэмакратаў за паражэнне на выбарах: Расія, Расія, Расія. Нягледзячы на гэта, я забяспечыў бум у нацыянальнай эканоміцы і, магчыма, дабіўся за 10 месяцаў больш, чым любы іншы прэзідэнт ЗША. Зробім Амерыку зноў вялікай!» — заявіў гаспадар Белага дома.

### Мадура абвясціў аб пачатку «нафтавай рэвалюцыі» і аддаў галіну пад кантроль ваенным

Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура ў нядзелю, 26 лістапада, прызначыў новым кіраўніком нацыянальнай нафтавай кампаніі Petroleos de Venezuela (PDVSA) генерал-маёра Нацыянальнай гвардыі Мануэля Кеведа. Ён жа будзе новым міністрам нафтавай прамысловасці краіны.

«Надышоў час для новай нафтавай рэвалюцыі», — абвясціў Мадура. Прэзідэнт заявіў, што Кеведа ачысціць галіну ад карупцыі, наладзіць здабычу нафты і палепшыць работу нафтаперапрацоўчых заводаў. Якім чынам гэта ўдасца ваеннаму, які не мае адпаведнай адукацыі і вопыту, кіраўнік дзяржавы не ўдакладніў.

Reuters піша, што ў Кеведа няма абсалютна ніякага вопыту работы ў нафтавай галіне. Сам генерал-маёр на сваёй старонцы ў Твітары называе сябе «салдатам народа», вялікім прыхільнікам былога прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса.

Reuters таксама нагадвае, што прадстаўнікі апазіцыі неаднаразова вінавацілі генерал-маёра Кеведа ў парушэнні правоў чалавека і ў падтрымцы рэжыму Мадуры. Менавіта Кеведа, з'яўляючыся кіраўніком Нацыянальнай гвардыі, адказваў за задушэнне антыўрадавых пратэстаў у Венесуэле ў 2014 годзе.

Адзначым, што ў Венесуэле засяроджаны найбуйнейшыя ў свеце запасы нафты. Нягледзячы на гэта, у апошнія гады ў паўднёваамерыканскай краіне развіваецца востры фінансавы і палітычны крызіс.

### Кааліцыйныя перагаворы блока Меркель з СДПГ могуць пачацца толькі ў 2018 годзе

Перагаворы аб фарміраванні кіруючай кааліцыі паміж кансерватыўным блокам Ангелы Меркель з Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС) і Сацыял-дэмакратычнай партыяй Германіі (СДПГ) пачнуцца не раней за студзень 2018 года. Пра гэта заявіла ў панядзелак у эфіры тэлеканала ARD намеснік кіраўніка ХДС Юлія Клёкнэр.

«Я зыходжу з таго, што толькі ў пачатку наступнага года будзе дадзена зялёнае святло для пачатку кааліцыйных перагавораў», — сказала яна.

Як растлумачыла палітык, спачатку СДПГ трэба будзе правесці з'езд, які запланаваны на 7—9 снежня. «Потым трэба паглядзець, калі пачнуцца зандуючыя кансультацыі, і застаецца толькі тыдзень да зімовых парламенцкіх канікул, — дадала яна.

Германія апынулася на парозе палітычнага крызісу пасля таго, як ХДС/ХСС не ўдалося стварыць кіруючую кааліцыю са Свабоднай дэмакратычнай партыяй і «зялёнымі». Прэзідэнт ФРГ Франк-Вальтэр Штайнмаер пасля гэтага заклікаў парламенцкія партыі зрабіць усё, каб пазбегнуць перавыбараў у Бундэстаг.

■